№№31–32
(2551–2552)

23 лютага 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

БЛІЦ

Як вядома, 25 сакавіка дзень абвяшчэння Беларускай народнай рэспублікі — Дзень Волі. Звычайна дэмакратычная грамадскасць адзначае гэтую дату шэрагам масавых акцый. Аб тым, што яны адбудуцца і сёлета, заявілі некаторыя апазіцыйныя палітыкі. Але што для гэтага ўжо зроблена, як ідзе падрыхтоўка? Чамусьці ніякай інфармацыі на гэты конт няма. А можа, гэта мы, у рэдакцыі, не ведаем, а людзі ведаюць?

Карэспандэнт "Народнай волі" выйшаў на вуліцы Мінска з пытаннем:

Ці ведаеце вы, што будзе 25 сакавіка?

Дзіяна ПАЎЛАВЕЦ, пенсінерка:

— Так, я ведаю, што 25 сакавіка ўсе сумленныя грамадзяне Беларусі адзначаць Дзень Волі. На мой погляд, гэта самае галоўнае свята, якое ёсць у нашага народа. Шкада, канечне, што не ўсе пра гэта здагадваюцца. Дарэчы, здзіўляе і той факт, што зараз, за месяц да гэтай урачыстай даты, ніякай канкрэтнай інфармацыі няма. Дзіўна, што маўчаць лідэры нашай апазіцыі. Трэба ж падрыхтаваць людзей, арганізаваць. Як я разумею, з арганізацыяй людзей у нашай апазіцыі праблемы. Што яскрава пацвердзіла і мінулагодняя вясна, калі дзесяткі тысяч чалавек выйшлі на Плошчу... Пастаялі-пастаялі і разышліся.

Юрый АЛЕКСАНДРЫН, праграміст:

— Нічога не будзе. Па меншай меры, станоўчага. Ну, збярэцца пару тысяч чалавек. Ну, пройдуць па вуліцах, сцягамі памахаюць, "Жыве Беларусь!" пакрычаць, а потым АМАП разгоніць усіх... І навошта такое "святкаванне" патрэбна? Людзей у чарговы раз падставяць пад гумавыя міліцэйскія дубінкі — і ўсё.

Аляксей МАРХВІДА, беспрацоўны:

— 25 сакавіка — будзе вясна. Аб тым, што ў гэты дзень нешта павінна адбыцца, чую ад вас упершыню.

Сяргей ЛЕМЕШАЎ, будаўнік:

— А навошта вам мой фотаздымак? Не трэба. Адкуль я ведаю, што 25 сакавіка будзе? Я не магу сказаць, што заўтра будзе... Свята, кажаце? Не веру я вам. Выхаднога ж, здаецца, няма...

Юрый БЫЧКОЎ, інжынер:

— Я ўвогуле палітыкай не цікаўлюся. Мне здаецца, што кожны павінен займацца сваёй справай. Працаваць, зарабляць грошы, карміць сям'ю. А палітыкай павінны займацца выключна палітыкі. Таму мне няма абсалютна ніякай справы, што адбудзецца (ці не адбудзецца) 25 сакавіка.

Арсеній АДАРЧАНКА, супрацоўнік фізкультурна-аздараўленчага цэнтра Першамайскага раёна г.Мінска:

— Я ўвогуле з'яўляюся прыхільнікам Аляксандра Лукашэнкі. На апошніх выбарах за яго галасаваў. Мне добра жывецца. А апазіцыя наша, шчыра кажучы, слабая. І ўсё, што яны робяць, — марная справа. Нехта гранты, ці як гэта там называецца, атрымлівае, а збіваюць дзяцей... І 25 сакавіка гэта яшчэ раз пацвердзіцца, калі і будзе нейкі мітынг. Але я ніколі не хадзіў і не пайду на гэтыя мітынгі.

Ігар ЮРТАЎ, дзіцячы футбольны трэнер:

— Што, Дзень Волі? Першы раз чую. Я вам так адкажу, хаця вы наўрад ці напішаце. За апошнія гады, калі наш прэзідэнт надаў шчыльную ўвагу спорту, шмат што змянілася ў лепшы бок. Вось вы мне гаворыце пра нейкі там мітынг, апазіцыю... Яна, апазіцыя ваша, толькі і можа, што бессэнсоўна мітынгаваць з нагоды і без яе. Пакажыце мне хоць аднаго апазіцыянера, які дзецям мяч футбольны ў школу прынёс. Проста так, бескарысна...

Дзмітрый МАШКОЎ, гісторык:

— Канечне, пра 25 сакавіка я ведаю. Адукацыя ў мяне адпаведная. Гэта дзень абвяшчэння БНР. Ведаю, што свята адзначаецца пад бел-чырвона-белым сцягам. Але сам я ніколі ў мітынгах не ўдзельнічаю. Часу шкада, ды і не для мяне гэта.

Ігар СТРЫЖ, прадпрымальнік:

— На пытанне адкажу, але фатаграфавацца не буду. Я абавязкова пайду на мітынг, калі ён будзе. Хаця пра тое, што нешта адбудзецца і ў якім фармаце Дзень Волі будзе адзначацца, я, шчыра прызнацца, не чуў. На плошчу пайду, каб стаць плячо ў плячо з людзьмі, якія пераадолелі страх і хочуць быць вольнымі на сваёй зямлі.

Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.

ОФИЦИАЛЬНО

Сотни тысяч долларов на борьбу с птичьим гриппом тратит Беларусь

В прошлом году только на мониторинг птицефабрик страны было потрачено 240 миллионов белорусских рублей.

Эту информацию обнародовал начальник главного управления ветеринарии Министерства сельского хозяйства **Александр АКСЕНОВ**. По его словам, сегодня на всех 78 птицефабриках страны приняты меры по биологической защите птиц. Кроме того, продолжается вакцинация птиц от птичьего гриппа. Это, к слову, мероприятие не из дешевых. По словам специалиста, одна прививка стоит 40 центов, а взрослой птице их необходимо сделать две. В прошлом году, например, было привито около трех миллионов кур. В этом году будет закуплено как минимум миллион доз вакцин. По словам Александра Аксенова, закупки будут проходить по ценам прошлого года.

Кроме того, специальное оборудование для диагностики птичьего гриппа намерена передать нашей стране Россия. Новые аппараты получат четыре центра гигиены и эпидемиологии страны. Стоимость оборудования — полтора миллиона долларов. Но Беларусь не заплатит за него ни копейки. "Это будет гуманитарная помощь или техническая, как раз сейчас идут консультации с МИД, как правильно оформить груз, — сообщил главный санитарный врач Беларуси **Михаил РИМЖА.**

Алеся КОВАЧ.

ЗДЫМАК ГОДА

*Радыё Свабода — гэта больш чым радыё. Гэта яшчэ Інтэрнет, кнігі, культурніцкія праграмы, фотахроніка Супраціву і Адраджэння. Днямі дырэктар Беларускай службы Радыё Свабода Аляксандр Лукашук абвясціў вынікі фотаконкурсу. Лепшым здымкам 2006 года прызнана работа **Яўгена Ацецкага**. Кадр зроблены ў Мінску 25 сакавіка. Аўтар узнагароджаны вандроўкай у Прагу.*

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

РУБАМ!

Да адказнасці!

Кансерватыўна-Хрысціянская партыя патрабуе прыцягнуць А.Лукашэнку да крымінальнай адказнасці за фальсіфікацыю прэзідэнцкіх выбараў

Як толькі А.Лукашэнка сам публічна прызнаўся ў фальсіфікацыі выбараў, Кансерватыўна-Хрысціянская партыя звярнулася ў Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь з просьбай прыцягнуць яго да адказнасці. І вось адказ:

"Ваша заява ад імя сойму Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — БНФ аб узбуджэнні крымінальнай справы па выніках галасавання на выбарах 19 сакавіка 2006 г. пакінута без задавальнення ў сувязі з тым, што пастаўленыя пытанні не ўваходзяць у кампетэнцыю Вярхоўнага суда".

Вядома ж, паплечнікі Зянона Пазьняка не могуць пагадзіцца з такой адмовай. І сойм Партыі прыняў рашэнне накіраваць у Пракуратуру Рэспублікі Беларусь заяву наступнага зместу:

"У адпаведнасці з арт.10 Закона "Аб Пракуратуры Рэспублікі Беларусь" заяўляем аб неабходнасці пракурорскага рэагавання і прыняцця мер у сувязі з грубым парушэннем заканадаўства, сутнасць якога ў наступным.

23 лістапада 2006 года Аляксандр Лукашэнка, які займае вышэйшую службовую пасаду ў дзяржаве, падчас прэс-канферэнцыі для ўкраінскіх журналістаў агучыў інфармацыю наступнага зместу:

"...Да, последние выборы мы сфальсифицировали. Я уже западникам это говорил. За президента Лукашенко проголосовало 93,5 процента. Говорят — это не европейский показатель. Мы сделали 86. Это правда было. И если сейчас начать пересчитывать бюллетени, то я не знаю, что с ними делать вообще. До выборов нам говорили, что если будут примерно европейские показатели на выборах, то мы ваши выборы признаем. Мы собирались сделать европейские показатели. Но тоже, видите, не получилось. Запад пообещал, что если итоги будут европейские, то все будет нормально. Сделали европейские — ненормально".

Гэтая інфармацыя была агучана на Беларускім тэлебачанні падчас прамой трансляцыі прэс-канферэнцыі і распаўсюджана сродкамі масавай інфармацыі, у тым ліку агенцтвам БелаПАН (http://naviny.by/rubrics/politic/2006/11/23/ic_news_112_262647/) і газетай "Народная воля", №№192—193 за 1 снежня 2006 г.).

Паведамленне А.Лукашэнкі аб яго ўдзеле ў фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, якія адбыліся 19 сакавіка 2006 г., утрымлівае прамое парушэнне артыкула 192 "Парушэнне заканадаўства аб выбарах, рэферэндуме або адкліканні дэпутата" і артыкула 424 "Злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі" Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Грубае парушэнне А.Лукашэнкам заканадаўства Рэспублікі Беларусь нанесла вялікія страты дзяржаўным інтарэсам. Парушэнне агульнапрызнаных міжнародных норм правядзення дэмакратычных выбараў стала адной з прычын скасавання ў 2006 годзе гандлёвых прэферэнцый для Беларусі з боку краін Еўрасаюза і Канады.

Пытанне аб адказнасці за грубае парушэнне заканадаўства намі было пастаўлена перад Вярхоўным судом Рэспублікі Беларусь 19 студзеня 2007 года. Суд не адмаўляе наяўнасці парушэння заканадаўства спадаром Лукашэнкам А.Р., аднак не прыняў мер для вырашэння пытання ў адпаведнасці са сваёй кампетэнцыяй і даў фармальны адказ".

Калі з боку Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі будзе сапраўдная, а не паказушная ўпартасць то, можа, нечага яна некалі і даб'ецца. Але засмучае тое, што яе барацьба ў большасці выпадкаў носіць, можна сказаць, віртуальны характар. Як і ўсіх астатніх партый.

Андрэй КУЗЬМЯНКОЎ.

Зробім 2007 год годам беларускай мовы і культуры!

21 лютага многія краіны свету адзначылі Дзень роднай мовы. Гэта традыцыя была запачаткавана рашэннем ЮНЕСКА і бярэ свой адлік з 1999 года. З кожным годам гэтае свята набывае ўсё больш шырокі рэзананс у розных грамадствах свету.

Сёлетні 2007 год адметны для нашай краіны і роднай беларускай мовы. У гэты год мы адзначаем 125-годдзе з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Іх адданасць роднаму слову і свайму народу служыць прыкладам сапраўднага патрыятызму для ўсіх грамадзян Беларусі незалежна ад іх нацыянальнасці.

Рада ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" звяртаецца да грамадзян Рэспублікі Беларусь з заклікам падпісаць і накіраваць на імя А.Р.Лукашэнкі наступны ліст:

Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку
220050, г. Мінск, вул. К. Маркса, 38

Мы, грамадзяне Рэспублікі Беларусь, хочам нагадаць Вам, што ў 2007 годзе споўніцца 125 гадоў з дня народзінаў класікаў нашай літаратуры, вядомых грамадскіх дзеячаў, палітыкаў і навукоўцаў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

У сувязі з гэтым мы прапануем выдаць адпаведны Указ, у якім варта адлюстраваць наступнае:

* Абвясціць 2007 год (па прыкладзе суседняй Расіі) годам беларускай мовы і літаратуры.
* Вярнуць у сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны курс "Беларусазнаўства".
* Аднавіць выкладанне гісторыі і геаграфіі Беларусі ў школах з рускай мовай навучання на дзяржаўнай беларускай мове.
* Адкрыць у Мінску Нацыянальны універсітэт з выкладаннем усіх прадметаў па-беларуску і надаць яму імя Якуба Коласа.
* Вярнуць у адукацыйныя стандарты для ВНУ абавязковае выкладанне курса "Беларуская мова: прафесійная лексіка".

№	Прозвішча, імя	Адрас пражывання	Дата падпісання	Подпіс
1.				
2.				
3.				
4.				
5.				
6.				
7.				
8.				
9.				
10.				

КРЫМІНАЛ

Каўбасы з падполля

У пасёлку Мачулішчы (Мінскі раён) у мінулыя выхадныя супрацоўнікамі міліцыі быў выяўлены падпольны мясаперапрацоўчы цэх, што належаў індывідуальнаму прадпрымальніку, жыхару Мінска.

Як паведамілі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, устаноўлена, што дзейнасць цэха арганізавана адным са сталічных ТДА, дырэктарам якога з'яўляецца жыхар вёскі Валяр'янава. Дазвол на арганізацыю вытворчасці па перапрацоўцы мяса і выраб каўбасных вырабаў у фірмы адсутнічае. Запрошаныя для правядзення далейшага разбору спецыялісты Мінскай абласной ветэрынарнай службы вынеслі заключэнне аб недабраякаснасці прадукцыі і неадпаведнасці санітарна-эпідэміялагічным патрабаванням вытворчага абсталявання, а таксама памяшканняў цэха.

Падчас агляду знойдзена і канфіскавана з вытворчага абароту недабраякасная прадукцыя — мяса курэй, субпрадукты, ялавічына, свініна, гатовыя каўбасныя вырабы ў колькасці 4 тоны, падрыхтаваныя для рэалізацыі ў гандлёвай сетцы Мінска і Мінскага раёна пад таварным знакам Полацкай птушкафабрыкі.

Дзейнасць перапрацоўчага цэха прыпынена да заканчэння разбору.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
23 ЛЮТАГА 2007 г.

ПАЛІТКУХНЯ

Шчыра сказаць, скандал у дэмакратычным блоку ўзнік не сёння. Але не хочацца верыць, што аднадумцы і былыя члены адной каманды не здолеюць памужчынску, сам-насам пераадолець хваравітыя амбіцыі. Бо, па вялікім рахунку, заваёў у дэмакратаў не так шмат, каб дзяліць лідэрства.

І ўсё ж скандал успыхнуў, і першыя спробы яго патушыць плёну не мелі. Прапануем чытачам самім зрабіць высновы і прыняць той ці іншы бок у спрэчцы.

Аляксандр Мілінкевіч адмаўляецца ад удзелу ў Кангрэсе дэмакратычных сіл

Зварот да дэмакратычнай грамадскасці Беларусі

Паважаныя сябры!

У кастрычніку 2005 года Кангрэс дэмакратычных сіл абраў мяне адзіным кандыдатам у прэзідэнты Беларусі. Дзякуючы аб'яднанню тысяч мужных і адданых Бацькаўшчыне грамадзян, мы правялі паспяховую палітычную кампанію, сабралі сотні тысяч подпісаў, сустрэліся з выбаршчыкамі ў большасці раёнаў краіны. Шмат людзей пазбавіліся страху і апатыі, нягледзячы на тое, што ўлада кінула ў турмы больш за тысячу чалавек. Сотні студэнтаў былі выключаны з ВНУ, шмат каго пазбавілі працы за "палітыку". Хоць рэжым устаяў, але мы перамаглі ў свядомасці многіх людзей. Мільёны, што галасавалі за нас, выбралі каштоўнасную альтэрнатыву: "Свабоду, Праўду, Справядлівасць".

Сёння ў свеце ўжо ніхто не сумняваецца: беларусы — гэта народ, які дастойны быць вольным і гатовы змагацца за Свабоду.

Я быў упэўнены, што пасля выбараў мы працягнем супольную працу ў кааліцыі, бо перамагчы можна толькі разам. Тым больш што я адчуваў і адчуваю тую вялікую падтрымку і чаканні нашых суграмадзян. А яны хочуць, каб у нас была адзіная стратэгія, адзін штаб, адзіны лідэр.

Аднак кансалідацыі не адбылося. Палітычны савет аб'яднаных дэмакратычных сіл не змог выканаць аб'яднаўчую місію. Паўгода зацвярджаўся план дзейнасці, а калі быў урэшце прыняты, савет нават не змог стварыць выканкам для яго рэалізацыі. Замест арганізацыі супольнай працы некаторыя кіраўнікі партый пачалі змагацца за лідэрства і шматмесячную падрыхтоўку да Кангрэса. Многія актывісты так захапіліся барацьбой за месца на гэтым форуме, што забыліся пра галоўнае — працу з людзьмі — нават падчас мясцовых выбараў.

На вялікі жаль, першапачатковыя дамоўленасці былі ануляваныя, зменены працэдуры вылучэння дэлегатаў на Кангрэс, а з прычыны пэўных маніпуляцый з подпісамі рэзка ўзмацнілася напружанасць унутры кааліцыі, асабліва ў рэгіёнах.

Я — за аб'яднанне дэмакратычных сіл, я — за Кангрэс, але Кангрэс, які будзе скліканы паводле празрыстых, узгодненых працэдур і мець шырокае дэмакратычнае прадстаўніцтва. Я гатовы ўзяць удзел у новым Кангрэсе, толькі калі на ім будзе абраны лідэр аб'яднаных дэмакратычных сіл з дастатковымі для арганізацыі эфектыўнай дзейнасці паўнамоцтвамі.

Кангрэс мае адбыцца праз месяц, але і сёння няма ўзгодненых пазіцый па ягоным змесце і мэтах. Нядаўна Палітычны савет прыняў рашэнне, што адзіны лідэр не патрэбны. Гэта адкідвае нас на некалькі гадоў назад у пабудове альтэрнатывы існуючаму рэжыму. Лідэрамі будуць цяпер усе кіраўнікі партый, толькі па чарзе на некалькі месяцаў.

Я больш не магу заставацца закладнікам такой сітуацыі і не хачу ўдзельнічаць ва ўнутраных разборках. Дэмакратаў шмат у чым справядліва папракаюць у адсутнасці рэальных дзеянняў. Я супраць таго, каб канкурэнцыя паміж лідэрамі партый паглынула ўвесь патэнцыял дэмакратычнай кааліцыі.

Таму заяўляю пра немагчымасць майго ўдзелу ў маючым адбыцца ў сакавіку Кангрэсе, бо ён прывядзе толькі да раз'яднання дэмакратычных сіл.

Сёння нам трэба ўсе намаганні скіраваць на падрыхтоўку беларускага Дня Волі.

Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ.

Партыя БНФ не прымае ультыматумаў і прапануе кампраміс

Ліст-зварот да Аляксандра Мілінкевіча і калег па дэмакратычным блоку накіраваў і лідэр партыі БНФ Віцук Вячорка.

"Сёння, калі наша краіна ўваходзіць у небяспечны для яе будучыні эканамічны і палітычны крызіс, перад Аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі стаяць неадкладныя і стратэгічна важныя задачы, а менавіта:

1. Распрацаваць і данесці да беларускіх грамадзян Антыкрызісную стратэгію — праграму пераадолення крызісу, эканамічных і палітычных рэформ, зберажэння і ўмацавання незалежнасці.

2. Пераканаць Еўрапейскі Саюз і ЗША, што эканамічная дапамога Беларусі, якую мы віталі б у цяперашняй сітуацыі, мусіць увязвацца з патрабаваннямі дэмакратызацыі (вызваленне палітвязняў з адменай рэпрэсіўных законаў, па якіх яны засуджаныя: свабода сходаў і маніфестацый, забарона ўжываць фізічную сілу супраць мірных маніфестантаў; свабода друку з вяртаннем незалежных газет у кіёскі "Белсаюздруку" каталогі "Белпошты", мясцовыя друкарні; дэмакратычныя папраўкі ў Выбарчы кодэкс і выбарчую практыку).

3. Вымусіць беларускія ўлады (у тым ліку і з дапамогай масавых мірных маніфестацый) пайсці з Аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі на перамовы аб правядзенні свабодных выбараў.

Усе гэтыя задачы могуць быць выкананы толькі пры ўмове адзінства дэмакратычных сіл. Без адзінства ніхто аднаасобна не зможа быць партнёрам на двухбаковых ці шматбаковых перамовах. Дый беларускія грамадзяне хочуць ведаць перадусім пазіцыю Аб'яднаных дэмакратычных сіл, а не прыватныя думкі.

Форумам, дзе магчыма сфарміраваць дэлегацыі для перамоў, а таксама прыняць праграму рэформ і план дзеянняў, можа быць толькі Кангрэс аб'яднаных дэмакратычных сіл. Але Кангрэс не павінен быць месцам канфрантацыі і спрэчак. Усе дэмакратычныя лідэры павінны сцішыць персанальныя амбіцыі, пачуць аргументы адзін аднаго і знайсці агульнакарысны кампраміс перад Кангрэсам. Таму я заклікаю сп. Мілінкевіча не станавіцца на пазіцыю ультыматумаў і супрацьпастаўлення сябе ўсім партыйным і грамадскім лідэрам.

Пераканаўшыся ў неэфектыўнасці спроб кулуарна дамовіцца, зыходзячы з пачуцця адказнасці за лёс краіны, я як лідэр Партыі БНФ адкрыта звяртаюся да ўсіх лідэраў Аб'яднаных дэмакратычных сіл, перадусім да сп. Мілінкевіча, з прапановай падпісаць да 25 лютага 2007 г. (за месяц да 25 сакавіка — Дня волі) дамову пад назвай "Кампраміс дзеля адзінства", якая б дазволіла як зберагчы шырокае адзінства, гэтак і эфектыўна выкарыстаць патэнцыял А.Мілінкевіча. Вось яе асноўныя тэзы.

Кампраміс дзеля адзінства

I. Правесці 7-ы Кангрэс АДС у маі 2007 г.

Дэлегатамі Кангрэса з'яўляюцца:

1) Дэлегаты 6-га Кангрэса (2005 г.).

2) Кандыдаты ў дэпутаты мясцовых саветаў у 2007 г., якія сабралі больш за 300 подпісаў за сваё вылучэнне, і актывісты, якія сабралі больш за 300 подпісаў пад Маніфестам "За Свабоду" (легітымнасць гэтых дэлегатаў гарантуе назіральная камісія АДС, якая складаецца з прадстаўнікоў усіх партый і А.Мілінкевіча).

II. На Кангрэсе абіраецца старшыня Палітычнай рады (ПР), які склікае ПР, старшынствуе на яе пасяджэннях, узначальвае дэлегацыі ПР пры міжнародных кантактах і на перамовах з уладай, кантралюе дзейнасць прэзідыума ПР. (Партыя БНФ прапануе абраць на гэту пасаду А.Мілінкевіча і лічыць вартым, каб з такой прапановай да Кангрэса звярнулася цяперашняя Палітычная рада).

Палітычная рада фарміруецца фракцыямі дэлегатаў Кангрэса (партыйнымі і непартыйнымі) прапарцыянальна колькасці дэлегатаў у фракцыі — 1 сябар ПР ад 10 дэлегатаў Кангрэса.

Прэзідыум Палітычнай рады складаецца з кіраўніцтва фракцый, якія маюць колькасць больш за 10% ад агульнай колькасці дэлегатаў Кангрэса. Прэзідыум з'яўляецца выканаўчым органам ПР. Старшынствуюць у Прэзідыуме яго сябры па чарзе, на ратацыйнай аснове. Рашэнні прымаюцца кансэнсусам. Любы сябар Прэзідыума і старшыня ПР можа апратэставаць рашэнне Прэзідыума і вынесці спрэчнае пытанне на пасяджэнне ПР, дзе рашэнне будзе прымацца простай большасцю галасоў. Старшыня Прэзідыума кантралюе дзейнасць старшыні ПР і наадварот.

III. Кангрэс прымае праграму рэформ, план дзейнасці АДС на 2007—2008 гг., звароты да беларускага народа, да беларускіх уладаў, да міжнароднай супольнасці. Усе праекты дакументаў павінны быць даведзены да дэлегатаў Кангрэса не пазней 25 сакавіка 2007 г., абмеркаваны дэлегатамі і падпісаны кіраўнікамі суб'ектаў АДС не пазней як за месяц да дня правядзення Кангрэса.

Спадзяюся, што гэтая кампрамісная прапанова паслужыць асновай для дыскусіі і канструктыўнай супрацы ўсіх адказных палітычных сіл.

З павагай —

Вінцук ВЯЧОРКА,
старшыня Партыі БНФ

СІТУАЦЫЯ

Адзін супраць усіх: прайгрюць усе

Здарылася тое, што можна было чакаць: Аляксандр Мілінкевіч адмаўляецца ад удзелу ў Кангрэсе дэмакратычных сіл, які запланаваны на 17—18 сакавіка.

Як высветлілася, спачатку Мілінкевіч давёў сваё рашэнне да лідэраў Партыі камуністаў Беларускай — Сяргея Калякіна, АГП — Анатоля Лябедзькі і старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі, а затым публічна звярнуўся да дэмакратычнай грамадскасці краіны з лістом, у якім патлумачыў прычыны свайго няўдзелу ў форуме.

І ўсё ж кіраўнік аргкамітэта па правядзенні Кангрэса Аляксандр Бухвостаў заявіў "Народнай волі", што працэс падрыхтоўкі да Кангрэса ідзе. Праўда, пакуль невядома, ці ўдасца знайсці ў Беларусі месца для правядзення форуму. *"Будзем весці перамовы з Мінскім трактарным заводам аб правядзенні Кангрэса ў Доме культуры МТЗ"*, — кажа А.Бухвостаў. Праблема ўскладняецца тым, што дасюль няма прынцыповага адказу з Мінгарвыканкама: дазволіць ці не дазволіць сталічная вертыкаль (*хоць усе ведаюць, хто вырашае гэтае пытанне.* — **Аўт.**) праводзіць мерапрыемства ў прынцыпе? У любым выпадку — дома ці ў эміграцыі — Кангрэс пройдзе. Хаця кіраўнік аргкамітэта з'яўляецца прыхільнікам правядзення мерапрыемства на беларускай зямлі.

Адмову А.Мілінкевіча ўдзельнічаць у Кангрэсе аргкамітэт і асабіста Аляксандр Бухвостаў успрымаюць негатыўна. *"А як яшчэ можна ўспрыняць адмову? — задае Бухвостаў рытарычнае пытанне. — Аднак усе кропкі над "і" будуць расстаўлены на пасяджэнні палітычнага савета. Трэба абмеркаваць усе пытанні, звязаныя з узаемаадносінамі паміж Мілінкевічам і кааліцыяй. Магчыма, існуюць проста непаразуменні паміж бакамі, а магчыма, ёсць і прынцыповыя разыходжанні".*

Бухвостаў, аднак, запэўніў: Кангрэс пройдзе ў любым выпадку — з Аляксандрам Мілінкевічам ці без ягонага ўдзелу.

Лідэр ПКБ Сяргей Калякін абвяргае сцвярджэнне А.Мілінкевіча аб тым, што дасюль не вызначаны мэты і задачы Кангрэса. *"Мэты Кангрэса вызначаны яшчэ ў пагадненні: выпрацоўка стратэгіі і тактыкі дзеянняў аб'яднаных дэмакратычных сіл, фарміраванне Палітсавета і выбары кіраўніка Палітсавета, якім на сёння і з'яўляецца Мілінкевіч. Ёсць прапановы ўвесці інстытут сустаршыняў. Лідэра не выбіраюць, лідэрам становяцца, прычым у канкурэнтнай барацьбе. Цяпер такая магчымасць з'явіцца — стаць лідэрам у канкурэнтнай барацьбе. Але, паўтаруся, гэта пытанне, якое не вырашана"*, — кажа Сяргей Калякін.

"Мілінкевіч у сваім звароце канкрэтна і адназначна заявіў: "у кастрычніку 2005 года Кангрэс дэмакратычных сіл абраў мяне адзіным кандыдатам у прэзідэнты Беларусі". 19 сакавіка 2006 года, пасля выбараў, Мілінкевіч перастаў быць адзіным кандыдатам. На жаль, прэзідэнцкія выбары не змянілі палітычную сітуацыю ў краіне, і Мілінкевіч не стаў прэзідэнтам. Але амаль год, як ён не можа з'яўлянца адзіным кандыдатам, бо наогул перыяд кандыдацтва і выбарчая кампанія скончыліся. Больш за тое, за Мілінкевічам няма нейкай палітычнай сілы, якая яго падтрымлівае, — вялікай ці малой. Хаця трэба прызнаць, што Мілінкевіча сапраўды падтрымліваюць каля 10% выбаршчыкаў. Сапраўды (і ў гэтым я згодны з Мілінкевічам), мы правялі прэзідэнцкую кампанію, і правялі яе няблага. Аднак цяпер склалася зусім іншая палітычная сітуацыя. Лёс Беларусі вырашае і Еўрасаюз, і Злучаныя Штаты, і Расія, і, вядома, кіраўнік Беларусі. Толькі аб'яднаныя дэмакратычныя сілы сёння фактычна выключаны з працэсу вызначэння лёсу Беларусі. Кангрэс мусіць засведчыць, што менавіта АДС з'яўляюцца адным з галоўных суб'ектаў пры вызначэнні лёсу Беларусі. А пытанне пра лідэра — унутранае пытанне, другараднае. Новы Кангрэс будзе рашаць новыя задачы", — заявіў Сяргей Калякін.

Старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка салідарны з камуністамі ў тым, што "пытанне пра лідэрства — другаснае, якое адцягвае ўвагу і дэмакратычнай супольнасці, і грамадскасці ад асноўных пытанняў: якую стратэгію мы прапануем краіне, эканоміцы".

"Я ацэньваю адмову Мілінкевіча адмоўна. У асяроддзі дэмакратычнай аб'яднанай апазіцыі нельга размаўляць адзін з адным мовай ультыматумаў. Ва ўсіх нас ёсць іншы праціўнік, а ў той сітуацыі, якая склалася цяпер, вінаваты ўсе дэмакратычныя сілы, у тым ліку і Мілінкевіч. У той жа час выхад з супольнага працэсу ніяк не магчымы", — мяркуе В.Вячорка.

Цяперашні канфлікт у вялікай ступені — гэта канфлікт персаналій, таму Партыя БНФ прынцыпова заняла нейтральную пазіцыю. "Шкада, што такую заяву Аляксандр Мілінкевіч зрабіў літаральна праз два дні, як Партыя БНФ прапанавала кампраміс, які дазволіў бы захаваць і зберагчы рэйтынг Мілінкевіча і ягоны міжнародны патэнцыял, і зберагчы адзінства ўсіх сур'ёзных палітычных сіл. Мы прапанавалі такі варыянт: Мілінкевіч прызначаецца паўнамоцным прадстаўніком АДС у міжнародных структурах — такі беларускі Хаўер Салана, а выканаўчую функцыю кіраўніка выконваюць па чарзе на ратацыйным прынцыпе лідэры тых палітычных суб'ектаў, якія маюць свае структуры ва ўсіх абласцях. Шкада, што Мілінкевіч адмовіўся ад удзелу ў Кангрэсе літаральна праз два дні пасля нашай прапановы", — падсумаваў Вінцук Вячорка.

"Гэта ўдар па ўсіх нас, у тым ліку і па Мілінкевічу", — перакананы старшыня Партыі БНФ.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

КОНТРМНЕНИЕ

Войтович предложил превратить Конгресс демсил в Национальное собрание

"Давайте используем Конгресс для объединения всех тех, кто чувствует ответственность за страну. Давайте проведем Национальное собрание, на котором обсудим все угрозы, которые стоят сегодня перед Отечеством, и пути нашего развития, попытаемся определить их направление", — говорится в обращении Войтовича.

В качестве участников или делегатов этого собрания Войтович хотел бы увидеть несколько иных людей, чем это представляется объединенным демократическим силам.

"Для этого пригласим на него (собрание) представителей и нынешних властных структур, и бывших руководителей Беларуси, интеллигенцию, представителей бизнеса, дипломатический корпус, специалистов из соседних стран", — предложил академик.

"Давайте обсудим наши проблемы вместе. Уже давно пора так сделать. Давайте начнем", — призывает Войтович, по мнению которого "так называемая "белорусская экономическая модель", которую так расхваливали власти и государственные средства массовой информации, сегодня показала свою недееспособность".

Однако какие бы тяжелые последствия ни ждали страну, еще более страшным и опасным представляет Конгресс или Собрание демократических сил, которое откроет г-н Коноплев или... и к тому же с участием "специалистов из соседних стран".

КУЛУАРЫ

Что не поделили?

Эксперты однозначны в оценках: конфликт в демократическом блоке возник из-за проблемы лидерства. Александр Милинкевич, с одной стороны, настаивает, чтобы на втором Конгрессе демократических сил был избран один лидер Объединенных демократических сил, но с другой стороны — его не устраивает предложенная процедура избрания лидера, поскольку при нынешнем составе делегатов Конгресса Милинкевич практически не имеет шансов оставаться "единым", поскольку большинства голосов, в отличие от первого Конгресса, у него теперь нет.

Напомним, что в соответствии с договоренностями, делегатами Конгресса являются кандидаты в депутаты местных Советов, набравшие в свою поддержку не менее 300 подписей избирателей. После подведения итогов выяснилось, что "контрольный пакет" голосов на Конгрессе получает "левый блок" — коммунисты, социал-демократы Александра Козулина, представители партии женщин "Надзея" и независимых профсоюзов во главе с Александром Бухвостовым. Блокирующий пакет голосов получает Объединенная гражданская партия и Анатолий Лебедько. Традиционный главный ресурс Александра Милинкевича в лице перешедших под знамена незарегистрированного движения "За Свободу!" неправительственных организаций оказать ему необходимую помощь не в состоянии. В отличие от предыдущего Конгресса НГО в выдвижении делегатов на новый форум оппозиции были пассивными.

Компромиссный вариант выхода из сложившегося кризиса предложен Партией БНФ. На обдумывание предложения Милинкевичу дали неделю. Однако уже появились предположения, что Александр Милинкевич будет под разными предлогами тянуть время до 25 марта. Если намеченная на этот день акция протеста оппозиции окажется многочисленной, и политик почувствует, что еще способен вести за собой массы, то у него будет неоспоримый аргумент. Ну а уж если нет...

Денис РУТКОВСКИЙ.

ТАК ДУМАЮ

Это не суверенитет...

Лукашенко ясно выразился: суверенитет Беларусь не потеряет. Это значит, что останется своя банковская система, свой рубль, и это главное.

Высказал свое мнение и вице-спикер Госдумы России Жириновский: *"Никаких президентов, новый Минский округ в России во главе с губернатором-белорусом, и все..."*

Можно сказать, Вольфович — чудак. Но Путин, между прочим, не считает его чудаком, а наградил Жириновского медалью, и для России это многое значит.

Впрочем, что такое наш суверенитет? Во-первых, сегодня им обладает, на мой взгляд, только сам президент и его хозобслуга. Народ совершенно бесправен в собственной стране. Если даже потенциальные оппоненты исчезают из жизни, если их на долгие годы заточают в тюрьму, если студентов силой заставляют подписываться за президента, а КГБ устраивает хапуны, как в далеком 1937-м.

Опомнитесь, у нас нет настоящего суверенитета, нет свободы!

А какой путь деградации за эти годы прошло население! Сначала нужно избавиться от паразитирующего класса, уничтожающего страну, восстановить экономику, оздоровить народ, в школах вместо "мастеров промывки мозгов" должны быть учителя, которые научили бы людей "людзьмі звацца".

Но решать эти проблемы нынешние власти, ясное дело, не намерены. Менять их — и только!

Зоя ВЕСНИНА,
жительница г.Мозыря.

ОТ СЕРДЦА — К СЕРДЦУ

Напишите им...

Ничего не стоит улыбнуться доброму соседу, уступить место незнакомой бабушке место в автобусе, прикусить язык при желании позлословить про коллег по работе. И сделать самый благородный поступок, возвышающий человека перед самим собой, — купить открытку и написать теплые слова политическим заключенным, находящимся в тюремных камерах и на поселении ради нас и нашей свободы.

Для них — Узников совести — нет ничего дороже, как получить от нас, наслаждающихся свежим воздухом и свободой передвижений, открытку или письмо.

Вот их адреса:

АВТУХОВИЧ Николай, лидер предпринимательского движения: 220079, г.Минск, ул.Кальварийская, 36, ИК №1, п/я 35, отряд №3.

ДАШКЕВИЧ Змитер: Могилевская обл., г.Шклов, 213004, исправительная колония №17.

КОЗУЛИН Александр Владиславович, экс-кандидат в президенты Беларуси, лидер Белорусской социал-демократической партии (Грамада): 211300, Витебская обл., Витебский район, пос.Витьба, ИК-3, 1-й отряд.

СЕВЕРИНЕЦ Павел, молодежный лидер: 211656, Витебская область, Полоцкий район, д.Малое Ситно, ул.Лесная, 11.

КИШКУРНО Антон: г.Новополоцк-5, ИК-10, 12-й отряд.

СТАТКЕВИЧ Николай: д.Блонь Пуховичского района Минской области.

ФИНЬКЕВИЧ Артур, молодежный лидер: 212002, г.Могилев, ул.Пушкина 65, ИУОТ №43, комната 211.

САДОВСКАЯ Екатерина, правозащитница: 246035, г.Гомель, ул.Антошкина, 3, ИК №4.

Людмила ГРЯЗНОВА.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Прозвішча Ганчар вяртаецца ў палітыку

Ці праўда, што жонка зніклага палітыка Віктара Ганчара — Зінаіда Аляксандраўна Ганчар — перанесла цяжкую аперацыю? Як яна сябе адчувае?

Ганна СЯМЁНАВА, Мінск.

Усю раніцу ў аўторак мы тэлефанавалі Зінаідзе Аляксандраўне, каб даведацца пра яе здароўе, але "металічны голас" упарта адказваў: "Сувязь з нумарам адсутнічае. Патэлефануйце пазней". Пазней Зінаіда Аляксандраўна сама заехала да нас у рэдакцыю і прызналася, што сапраўды толькі нядаўна выпісалася з бальніцы пасля аперацыі апендыцыту. І патлумачыла, чаму "сувязь адсутнічала". Аказваецца, раніцай у аўторак пачалося пасяджэнне выканаўчага камітэта Цэнтральнага Савета па стварэнні Саюза левых партый. На гэтым пасяджэнні лідэр Партыі камуністаў Беларускай Сяргей Калякін прапанаваў зацвердзіць кандыдатуру Зінаіды Ганчар на пасадзе прэс-сакратара. Рашэнне было прынята адзінадушна. "Так што мне цяпер і часу няма хварэць", — гаворыць Зінаіда Аляксандраўна.

Лілія ВОРАНАВА.

ЧУЛІ?

Паўла Севярынца не вызвалілі

У аўторак спецыяльная камісія адмовілася ўмоўна-датэрмінова вызваліць маладзёжнага актывіста Паўла Севярынца.

На пасяджэнні камісіі сам Павел заявіў, што не прызнае сябе вінаватым і не збіраецца выпраўляцца.

Нагадаем, што Севярынец быў першым з лідэраў незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт", які апынуўся за кратамі. Ён асуджаны да двух гадоў пазбаўлення волі ў калоніі-паселенні за арганізацыю акцыі пратэсту супраць вынікаў рэферэндуму 2004 года, у выніку якога Аляксандр Лукашэнка змог у трэці раз стаць кіраўніком Беларусі. Зараз Севярынец адбывае пакаранне ў вёсцы Малое Сітна Полацкага раёна. Праз шэсць месяцаў ён павінен выйсці на волю.

Лілія ВОРАНАВА.

Перагоншчыкі апынуцца па-за законам

З 1 ліпеня гэтага года ўступае ў дзеянне новы Мытны кодэкс Рэспублікі Беларусь, якім фактычна будзе спынены бізнес шматлікай арміі перагоншчыкаў, якія дастаўляюць легкавыя аўтамабілі з рынкаў заходніх краін беларускім пакупнікам.

У новым Мытным кодэксе вызначана, што гэты від дзейнасці з'яўляецца дзейнасцю па грузаперавозках. Адпаведна на яе трэба атрымаць ліцэнзію ў Міністэрстве транспарту, зарэгістраваць фірму і г.д. "Пры адсутнасці такіх дакументаў — па даверанасці — мытныя органы прапускаць машыны не будуць", — паведаміў намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір Гошын.

Ул.інф.

Народная Воля http://www.nv-online.info
23 ЛЮТАГА 2007 г.

АСОБА

Спецдакладчык па Беларусі

Палітычны камітэт Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) прызначыў дакладчыкам па сітуацыі ў Беларусі італьянскага дэпутата Андрэа Рыгоні.

Раней дакладчыкам па Беларусі з'яўляўся эстонскі дыпламат Андрэс Херкель. 13 красавіка 2006 года ён прадставіў сваю справаздачу на пазачарговых дэбатах ПАСЕ аб сітуацыі ў Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў.

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Аптыміст Андрэа Рыгоні

"Я лічу, што вельмі важна пачаць сваю працу, маючы выразнае ўяўленне пра сітуацыю ў Беларусі", — заявіў у эксклюзіўным інтэрв'ю БелаПАН новы дакладчык Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) па Беларусі Андрэа Рыгоні.

На яго думку, асабліва важна вывучыць сітуацыю з выкананнем такіх дэмакратычных стандартаў, як свабода думкі, свабода прэсы і незалежнасць судовай сістэмы.

Ужо на пачатку сакавіка новы дакладчык ПАСЕ, паводле яго слоў, мае намер сустрэцца з кіраўніцтвам беларускага парламента.

А.Рыгоні падкрэсліў, што сам прасіў сваіх калег з Палітычнага камітэта ПАСЕ прызначыць яго на пасаду дакладчыка па Беларусі. "Я ўжо знаходзіўся ў Беларусі ў сакавіку 2006 года ў якасці міжнароднага назіральніка за прэзідэнцкімі выбарамі, — зазначыў дэпутат. — Мае наступныя візіты ў вашу краіну будзе планаваць сакратарыят ПАСЕ".

А.Рыгоні выказаў меркаванне, што ў Беларусі неабходна прасоўваць дэмакратычныя каштоўнасці. *"Я спадзяюся на больш высокую гатоўнасць і жаданне з боку беларускіх улад на збліжэнне з еўрапейскімі структурамі, у прыватнасці, з Саветам Еўропы і Еўрапейскім Саюзам"*, — сказаў італьянскі дэпутат. Ён зазначыў, што для наладжвання супрацоўніцтва Беларусі неабходна "паважаць і прытрымлівацца каштоўнасцяў Савета Еўропы". Пры гэтым А.Рыгоні падкрэсліў, што важны працяглы дыялог не толькі з уладамі, але і з апазіцыяй, прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці і няўрадавымі арганізацыямі.

На думку А.Рыгоні, адкрыццё ў Мінску Інфармацыйнага бюро Савета Еўропы будзе спрыяць наладжванню дыялогу. "Добрым крокам можа стаць і актывізацыя маладзёжных абменаў паміж Беларуссю і еўрапейскімі краінамі, а таксама спрашчэнне візавага рэжыму для садзеяння гэтым абменам", — сказаў А.Рыгоні.

Італьянскі палітык зазначыў, што наладжванне дыялогу — гэта працяглы працэс, які патрабуе шмат часу. "Але мы павінны быць поўныя рашучасці давесці яго да канца", — лічыць А.Рыгоні.

ПАМЯТЬ

Зачем нам это было нужно?

Около 29 тысяч белорусов в конце прошлого столетия воевали в далеком Афганистане (от Минска до Кабула почти 4000 км), более 700 человек там погибли. По-разному сложились судьбы вернувшихся домой: одни смогли адаптироваться, включившись в постперестроечный ритм жизни, кто-то стал инвалидом, у других по сей день дают о себе знать раны, а некоторые так и не смогли найти свое место под солнцем.

Всего же до 15 февраля 1989 года, когда из Афганистана были выведены последние советские части, на той войне, если верить официальным данным, погибли почти 15 тысяч военнослужащих советской империи. Оправданы ли были подобные жертвы? Понес ли кто-то из инициаторов кампании за это ответственность?

Сейчас уже известно, что в беседе с Тараки, основателем Народно-демократической партии Афганистана и первым руководителем Демократической Республики, А.Косыгин, бывший Председатель правительства СССР, разъяснял ему: "Наши общие враги только и ждут того момента, чтобы на территории Афганистана появились советские войска. Мы тщательно изучали все аспекты этой акции и пришли к выводу о том, что если ввести наши войска, то обстановка в нашей стране не только не улучшится, а наоборот, осложнится. Нельзя не видеть, что нашим войскам пришлось бы бороться не только с внешним агрессором, но и с какой-то частью нашего народа. А народ таких вещей не прощает" *(архив президента Российской Федерации. Рабочая запись беседы А.Н.Косыгина с Тараки, 20 марта 1979 года).*

И все же, вопреки политической линии, которой советское руководство придерживалось еще в самом начале декабря 1979 года, Политбюро ЦК КПСС 12 декабря официально принимает решение о вводе советских войск в Афганистан. Похоже, что спокойной взвешенной оценки обстановки в тот момент уже не было: 25 декабря в Афганистан вошла 40-я армия под командованием генерал-лейтенанта Юрия Тухаринова (с 1987 года и до вывода войск армией командовал генерал-полковник Борис Громов).

Такой тогда была система власти, таковы были методы принятия решений по важнейшим государственным вопросам. К слову, в СМИ даже не было вразумительного объяснения своему народу причин военного вмешательства, а советские военные советники в Афганистане узнавали о вступлении войск из передач иностранных радиостанций. Запущенная военная машина начинала действовать по своим внутренним законам: почти 10 лет ушло на искусственную поддержку марионеточного кабульского режима, а это требовало огромных финансовых и материальных ресурсов, подорвало и без того хромавшую последние годы экономику страны. А после чудовищной лжи руководства СССР в связи с аварией на Чернобыльской АЭС в 1986 году о якобы незначительном воздействии радиации на своих подданных — плачевные результаты афганской войны еще больше укрепили недоверие людей к правительству, стали мощным катализатором начала развала империи. Хотя и сейчас, к сожалению, нередко можно услышать, особенно от пожилых людей, что Советский Союз в Беловежской пуще "развалили" Ельцин, Кравчук и Шушкевич. За "развал" Союза достается и Михаилу Горбачеву, но при этом проклинающие последнего президента СССР предают забвению тот факт, что именно при Горбачеве войска были выведены из Афганистана: через месяц после прихода к власти он дал поручение тщательно проанализировать состояние афганской проблемы и выразил поддержку посреднической миссии ООН.

Афганом военнослужащие, а их в разное время воевало там от 80 до 104 тысяч человек, сокращенно и для удобства называли Афганистан, а местное население всех представителей "ограниченного контингента" называло "шурави", то есть — русский, в том числе таджиков и узбеков. Кстати, последние были там неплохими переводчиками.

В эту горную страну, расположенную в глубинной части Азии, находящуюся в тех же широтах, что и государства южного побережья Средиземного моря (Тунис, Марокко и Алжир), я был командирован из группы советских войск в Германии летом 1987 года. Мне почему-то не дали дослужить в Германии еще три положенных года и из одной еще незавершенной командировки спешно отправили в другую, будто бы во всей группе войск не нашлось офицера с аналогичной должностью, у которого заканчивались бы установленные сроки.

Артист Станислав Садальский, который на днях гостил в Тбилиси, выступил с резкой критикой в адрес российского посольства в Грузии и посла Вячеслава Коваленко, сообщает "Росбалт". Он обратился в российский МИД с просьбой прислать в Тбилиси лопату, "чтобы выгребать из штанов посла". Для чего конкретно предназначается лопата, артист не уточнил.

Возмущение Садальского вызвала реакция дипломатов на проходивший в Тбилиси спектакль "Семейный брак — любовная трагедия", в котором играл и он сам. Российское дипломатическое ведомство опровергло информацию СМИ о том, что пьеса была поставлена при его содействии. *"В организации этого спектакля мы участия не принимали"*, — заявил представитель посольства Иван Волынкин.

Это заявление звучало несколько двусмысленно, если учесть, что незадолго до этого президент Грузии Михаил Саакашвили в торжественной обстановке вручил Станиславу Садальскому грузинский паспорт и одну из высших государственных наград республики — орден Чести. Артист сам попросил о грузинском гражданстве в октябре 2006 года, выразив таким образом свой протест против кампании по преследованию грузин в России.

Садальский, по его словам, ожидал, что после спектакля, который восстанавливает духовные связи между двумя странами, российский посол скажет ему: *"Вот Вам деньги, или вот Вам грамота, спасибо, Вы делаете за меня мою работу". "Не-ет, я читаю сегодня, что они, видите ли, не имеют никакого отношения"*, — возмущается артист. *"Ну что, господин посол? Посол, а не посол бы ты?"* — добавил Садальский.

Lenta.ru

ЛЮБОПЫТНО

Открытка шла 90 лет

Почтовая карточка, посланная из окопов Первой мировой войны, 90 лет спустя доставлена по адресу.

18-летний рядовой Вальтер Батлер находился в окопах во Франции, откуда и послал открытку своей невесте Эмми Хикс в британский городок Коулерн, графство Уилтшир.

До невесты открытка, датированная 1917-м годом, не дошла. Зато недавно была доставлена ее 86-летней дочери, Джойс Халберт, адрес которой установили сотрудники почты.

Главная певунья мира

Жительница Южной Кореи Ким Секок установила мировой рекорд по караоке, спев около тысячи песен чуть меньше, чем за 60 часов.

После такого певческого марафона Ким Секок без сил рухнула на пол. Позднее она рассказала, что пела для больного мужа.

Ким взяла микрофон караоке в одном из сеульских баров в понедельник и пела до вечера в среду. По сообщениям, она на 36 минут "перепела" одного немца, установившего рекорд в караоке в прошлом году.

«Подмосковный» грипп опасен!

Разновидность птичьего гриппа, выявленная в Подмосковье, опасна для человека, сообщает РИА Новости. По словам пресс-секретаря Россельхознадзора Алексея Алексеенко, в ходе экспертизы было установлено, что птицы в пяти районах Московской области заражены азиатским вариантом птичьего гриппа H5N1. Этот вирус может передаваться человеку.

За год в Китае попались на взятках сто тысяч коммунистов

В 2006 году в Китае около 100 тысяч коррупционеров из правящей Коммунистической партии были подвергнуты дисциплинарным наказаниям. Тем не менее чиновники признают, что решить проблему взяточничества в короткое время почти невозможно, передает AFP. В 2005 году за коррупцию были наказаны 115 тысяч коммунистов.

Более 80 процентов наказанных были уличены во взятках или нарушении финансовых законов партии. Около трех с половиной тысяч человек были подвергнуты судебным разбирательствам. В их числе и семь чиновников, занимающих должности на уровне члена Кабинета министров или губернатора провинции.

За что?

Команда Кадырова, то есть группа чиновников, которую собрал вокруг себя первый пророссийский президент Чечни Ахмат Кадыров, с момента его гибели в результате теракта в мае 2004 года, рассматривала Рамзана как наиболее оптимального преемника отца. Исполнению мечты мешала конституция, которую жители Чечни только в марте 2003 года приняли всенародным голосованием. Она устанавливала 30-летний возрастной ценз для президента.

30 лет Рамзану исполнилось 5 октября 2006 года. Всенародно избранному президенту Алханову оставалось еще два года до окончания срока, но ему не постеснялись сразу же предложить уйти. Чеченец и милицейский генерал Алу Алханов стойко отвечал, что раз его избрал народ, то и отставка — дело Всевышнего или главнокомандующего. А оставаться в должности становилось крайне трудно: нетерпение наследника становилось все ощутимее. Рамзану было куда спешить — его карьера тоже зависит главным образом от главнокомандующего, а если дать Алханову доработать срок до конца, до августа 2008-го, главнокомандующий, он же президент России, может смениться. Чем ближе к выборам, тем меньше у главы государства возможностей что-то существенно менять.

Версия из российской газеты "Время новостей".

МОДНАЯ ТЕМА

Не спрашивайте, счастлив ли человек, пока он жив

В американской психологии прочно утверждается модная тема, которую можно озаглавить "Материалистичность и ее негативные последствия", а попросту "Что такое счастье?".

Собственно, она не нова. Во все времена философы и проповедники твердили, что меркантильность плохо сказывается на душе, только теперь вместо слова "душа" употребляют термин "эмоциональный тонус". Клиницисты бьют тревогу: погоня за материальными благами иссушает человека. Его жизнь комфортабельна, но душевно не комфортна. Практицизм убивает человеческие отношения и снижает самооценку; он сопряжен с риском депрессии и отнимает у человека время, которое можно было бы потратить на то, что делает его подлинно счастливым: на семью, друзей, интересные занятия. Одним словом, не в деньгах счастье...

Как совместить эту картину с заповедью, записанной 236 лет назад в американской Декларации независимости: *"Мы считаем самоочевидными истины, что все люди созданы равными и наделены Творцом неотъемлемыми правами, к числу которых относится право на жизнь, свободу и стремление к счастью"?* Простой человек не сомневается, что ему, живущему от зарплаты до зарплаты, лишние деньги не помешают. Да и тот, у кого есть достаток, испытает приятность от нового приобретения — по крайней мере, на какой-то срок. Ясно ему и то, что деньги стимулируют трудиться напряженнее, а порой и более творчески.

Однако профессор Иллинойского университета Эд Динар утверждает, что люди, ставящие материальный успех выше счастья, испытывают положительные и отрицательные эмоции в равной мере, в то время как те, кто ставит счастье выше материального успеха, переживают радость намного чаще, чем огорчения. А гарвардский профессор Дэниел Гилберт говорит: "Если бы деньги нас неизменно разочаровывали, мы бы давно преодолели тягу к ним. Загвоздка в том, что деньги все же приносят счастье, но не такое большое и не на такой долгий срок, на который мы рассчитываем".

Что все это значит? Люди правых политических взглядов квалифицируют приведенные умозаключения как пропаганду ненависти к капитализму и атаку на его институты. Те, кто не способен зарабатывать деньги, пытаются их обесценить, говорят они, — материальные банкроты объявляют деньги моральным банкротом. Почему левые считают умственную деятельность более верным путем к счастью, чем коммерческую? История не дает им никаких оснований. Скорее наоборот: зависть и мелочное соперничество разъедает интеллектуальную среду больше, чем бизнес-сообщество; и вообще, коммерческие конфликты уладить куда проще, чем идеологические.

Русская редакция **"Голоса Америки"** попросила высказать мнение по затронутой теме профессора Флоридского университета Даррина Макмэна, автора бестселлера "Счастье: история концепции".

Евгений Аронов: Профессор Макмэн, в истории Китая некоторые ученые выделяют два сменяющих друг друга цикла — материалистичный и антиматериалистичный. Первый характеризуется стремлением к осязаемым благам, второй — отказом от материальных ценностей, причем порой настолько сильным, что он сопровождался уничтожением основы прогресса — знаний. Видите ли вы похожие циклы в истории Европы?

Даррин Макмэн: Нет, не вижу. Я вообще скептически отношусь к теориям циклов в истории. Европейцы и их потомки в Северной Америке преимущественно ориентированы на внешние ценности, на материальный мир, хотя периодически Запад охватывают поветрия антиматериализма. Последние примеры тому — "зеленые" и хиппи. Тем не менее даже принципиально экстравертные общества вынуждены признать, что счастье людей слабо коррелировано с материальным достатком.

Е.А.: В своей книге вы приводите результаты исследований связей между субъективным душевным благополучием и объективными показателями роста уровня жизни. Эти исследования проводятся более полувека, ВВП всех стран с тех пор значительно вырос, а значение индекса счастья — нет. Как Вы это трактуете?

Д.М.: Люди быстро адаптируются к меняющимся условиям. К хорошему быстро привыкаешь. В то же время эволюция вложила в нас неистребимую тягу к удовольствиям и новизне. Так что, с одной стороны, мы обречены стремиться к материальным благам и их умножению, а с другой — получать от приращения благ лишь скоротечное удовлетворение. Когда оно проходит, наша субъективная оценка счастья возвращается почти к исходному значению.

Лицо успеха

Селестина Сеттерланд из Уэльса работает в супермаркете и выиграла 1 173 269 фунтов в лотерею. Ее партнер Карл доволен.

Е.А.: Христианство на раннем этапе тоже было враждебно богатству: "Легче верблюду пролезть в игольное ушко, чем богатому попасть в рай". Эта идеология сильно тормозила материальный прогресс, не так ли?

Д.М.: Вспомните историю царя Креза, который, несмотря на сказочное богатство, чувствовал внутреннюю потребность задаться вопросом, счастлив ли он. И с этого вопроса для него начались неприятности одна за другой. Перед казнью, которой он избежал благодаря вмешательству богов, Крез изрек знаменитую сентенцию: "Не спрашивайте, счастлив ли человек, пока он жив".

Иными словами, жизнь непредсказуема, сегодня человек богат, а завтра нищ, поэтому если он мудр, он не будет гнаться за богатством. Мудрость же греческие философы объявляли высшим непреходящим идеалом.

Е.А.: Таков Ваш прогноз на будущее?

Д.М.: На Западе, и в первую очередь в Америке, предпринимательство настолько сильно, что даже идеалы антибуржуазных движений, таких как хиппи, со временем коммерциализуются и трансформируются в ценности материалистичного общества. Так на свет появляются экологически чистые и экономичные автомобили, органические продукты, массаж горячими камнями, модные технологии утилизации вторсырья... Мой прогноз в том, что западная цивилизация, пока жива, останется устремленной к лучшей жизни.

Народная Воля http://www.nv-online.info
23 ЛЮТАГА 2007 г.

ЧУЛІ?

Кошты на мінскія кватэры абагналі еўрапейскія

За паўтара месяца, якія прайшлі з пачатку года, сярэдні кошт квадратнага метра ў сталіцы падняўся на 165 долараў.

Яшчэ напярэдадні Новага года аднапакаёвая кватэра памерам 35 квадратных метраў каштавала 42,5 тысячы долараў. Сёння за яе прадаўцы просяць ужо больш за 48 тысяч. Прычым гэта датычыцца самых сціплых кватэр альбо на ўскраінах, альбо ў вельмі непрывабных дамах.

Большасць аднапакаёвых кватэр выстаўляюцца па кошце ад 1600 да 1800 долараў за квадратны метр. Разам у сярэднім атрымліваецца 55 тысяч за "аднапакаёўку", што перавышае нават еўрапейскія кошты.

Напрыклад, у Берліне двухпакаёвая кватэра плошчай 55 квадратных метраў у 15 хвілінах язды ад цэнтра каштуе 50 тысяч еўра.

У Жабінцы прастойвае цукровы завод

З-за абмежаванняў паставак цукру ў Расію ў горадзе Жабінка Брэсцкай вобласці горадаўтваральнае прадпрыемства апынулася на мяжы крызісу. На складах завода назапасілася больш прадукцыі, чым тут выпускаюць за квартал. У сувязі з гэтым прадпрыемству пагражаюць прастоі.

Цяпер тут шукаюць новыя рынкі збыту, а мясцовыя ўлады вырашаюць, як дапамагчы людзям у выпадку скарачэння галоўнай гарадской вытворчасці, што прывядзе да звальнення вялікай колькасці працоўных.

Нагадаем, у выніку беларуска-расійскіх перамоў, якія адбыліся ў Маскве 17 студзеня, было дамоўлена, што наша краіна сёлета амаль удвая абмяжуе пастаўкі цукру ў Расію — да 180 тысяч тон. У наступным годзе пастаўкі скароцяцца да 100 тысяч тон.

Праверка ў прыватных ВНУ

Супрацоўнікі Міністэрства адукацыі праверылі веды студэнтаў недзяржаўных навучальных устаноў.

Вывад нечаканы: "прыватнікі" не толькі не саступаюць у падрыхтоўцы студэнтам дзяржаўных вышэйшых устаноў, але часам і пераўзыходзяць іх.

У нашай краіне на сённяшні дзень працуе 12 прыватных ВНУ, у якіх вучацца каля 58.000 студэнтаў.

Узровень падрыхтоўкі, а адпаведна, і ведаў ва ўстановах розных форм уласнасці зраўнаваліся, паведамілі прадстаўнікі Мінадукацыі.

Па матэрыялах інтэрнет-крыніц.

ГУМАР І НЕ ТОЛЬКІ

Клуб вясёлых і знаходлівых вымірае

Беларуская каманда «ЧП» пажартавала пра Лукашэнку і зараз амаль у поўным складзе працуе на Украінскім тэлебачанні.

Пра ўсё, што застаецца за кадрам тэлевізійнай гульні "Клуб вясёлых і знаходлівых", расказвае былы кавэзэшнік, член каманды "ЧП-Мінск" ***Павел ШАСТАКОЎ.***

Беларускія традыцыі ў КВЗ можна, бясспрэчна, назваць слаўнымі. Зборная БДУ пад кіраўніцтвам капітана Леаніда Купрыды па праву заняла месца ў залатым фондзе Клуба вясёлых і знаходлівых, хаця галоўны клубны трафей ёй так і не скарыўся. Паслядоўнікі зборнай — маладыя БДУшнікі — імкліва і сапраўды гуляючы атрымалі чэмпіёнскі тытул КВЗ. А потым у праграме Маслякова было "ЧП". Простыя беларускія хлопцы ў нязменных чорна-аранжавых касцюмах літаральна ўварваліся ў вышэйшую лігу, дзе спыніліся ўсяго за крок ад чэмпіёнства — фаварыт сезона-2005, на жаль, пахіснуўся ў фінале.

Але ўжо другі сезон галоўны турнір КВЗ праходзіць без беларусаў. Няўжо скончыліся ў нас вясёлыя і знаходлівыя? Пра гэта паразважаем з аўтарам пераможнай "Зборнай БДУ", а таксама аўтарам і акцёрам каманды "ЧП", зараз радыёвядучым і шоуменам Паўлам Шастаковым.

— Пачну зусім песімістычнай фразай: КВЗ памірае, — кажа Павел. — І не толькі ў нас. Разумееце, першапачаткова гэта была гульня, потым яна ператварылася ў шоу, зараз ужо больш нагадвае шоу-бізнес, баюся, што ў хуткім часе дадатак "шоу" знікне і застанецца адзін бізнес — простае зараблянне грошай на вядомым брэндзе.

Ведаеце, раней моладзь імкнулася трапіць у любую лігу, толькі каб з часам атрымаць магчымасць гуляць у КВЗ на высокім узроўні. А зараз ідуць у КВЗ, каб потым куды-небудзь уладкавацца — на тэлебачанне, радыё, у шоу-праграмы. Вось яскравы прыклад апошняга часу — Comedy club.

— Можа, гэта не так і дрэнна?

— Калі гэтае пытанне задалі Маслякову, ён адказаў прыкладна так: "Я вельмі паважаю ўдзельнікаў Comedy club, гэта сапраўдныя зоркі КВЗ. Але тое, што яны робяць, мне зусім не па душы". І я поўнасцю падзяляю меркаванне Аляксандра Васільевіча. Тое, што ў Клубе вясёлых і знаходлівых рабіць нельга, у Comedy club дазваляецца (гумар "ніжэй пояса", ненарматыўная лексіка). КВЗ — гэта сапраўдны жанр, са сваімі нормамі, правіламі, канонамі, ён патрабуе глыбокага, тонкага, а галоўнае, інтэлігентнага гумару. А Comedy ўсё спрасцілі, прабачце, часам да прымітыўнага.

— Мне здаецца, тут нельга забываць пра тое, што сапраўдныя кавэзэшнікі, у добрым сэнсе, проста хворыя на гэтую гульню. Падобныя праекты дапамагаюць былым ігракам клуба заставацца запатрабаванымі і па-за межамі фестывальных спаборніцтваў.

— У пэўным сэнсе не магу не пагадзіцца. Здаецца, абсалютная большасць маіх паплечнікаў па камандах наўрад ці зможа займацца чымсьці, акрамя гумару. Многія з членаў зборных БДУ працуюць у АМІКу, некаторыя пішуць сцэнарыі для актыўных каманд (напрыклад, для пераможцы мінулага сезона каманды РУДН пішуць нашы Віталь Шляпо і Віталь Каламіец). А вось каманда "ЧП" амаль у поўным складзе зараз працуе на адным з украінскіх тэлевізійных каналаў.

— А яшчэ сезон у вышэйшай лізе правесці не думалі? Гулялі ж зусім нямнога, ды і да чэмпіёнства не хапіла літаральна крышачку. Не збіраюцца "ЧП" парадаваць сваіх прыхільнікаў на беларускім тэлеканале альбо на іншым, даступным беларускім гледачам?

— Наўрад ці. Гэта хутчэй як рамантычная ідэя, усур'ёз ёю ніхто не займаецца. Бо і ў фінансавым, і ў маральным плане каманда ў суседняй краіне адчувае сябе зусім не дрэнна. Дарэчы, "ЧП" запрашалі ў беларускі Comedy club, але, як бачыце, прапанову не прынялі. Ды яшчэ і некаторыя ігракі адышлі. Я, напрыклад, з задавальненнем пагляджу КВЗ па тэлебачанні, калі атрымаецца, з'ездзіў бы калі-небудзь на сочынскі фестываль, але гуляць больш, напэўна, не стану. На першым плане ў мяне зараз сям'я — жонка і зусім маленькая дачушка. А яшчэ захацелася самастойнасці, каб не спрачацца, як у камандзе падзяліць ганарар пасля гастроляў.

— І тут грашовае пытанне... А ўвогуле, ці рэальна зарабляць у КВЗ?

— Яшчэ як! Вось Аляксандр Васільевіч Маслякоў — чалавек зусім не бедны.

Каманды, якія здолелі зрабіць сабе імя, выступаюць з канцэртамі, асабліва паспяховыя арганізуюць сапраўдныя гастролі. Асобных зорак КВЗ ахвотна запрашаюць на радыё і тэлебачанне. Зноў жа, можна пісаць для заможных каманд. Ходзяць чуткі, што РУДН на падрыхтоўку да гульні траціць некалькі дзесяткаў тысяч долараў (акрамя рэквізіту, касцюмаў ды фанаграм, добрая сума ідзе і аўтарам).

Трэба ўлічваць, што ў КВЗ ёсць каманды і праекты, а гэта зусім розныя паняцці. Напэўна, самы яскравы прыклад каманды — "ЧП", як казалі, найлепшая дваровая — усё саматугам, за свае грошы, голы энтузіязм. І адчуйце кантраст: "Утомленные солнцем" — праект усяго Краснадарскага краю. Яны нават турызм праз КВЗ рэкламуюць! Там першапачаткова былі добрыя фінансы мясцовай улады, на якія і збіралі калектыў. Падзялюся сакрэтам: у Беларусі таксама ёсць арганізацыя, якая хацела б стварыць такі КВЗ-праект — сабраць кемлівых людзей, даць камандзе імя сваёй кампаніі, каб брэнд быў на слыху і такім чынам раскручваўся. У суседніх краінах ужо даўно зразумелі, што рэклама ў клубе вельмі эфектыўная, спонсарскія грошы хутка вяртаюцца.

Многія каманды КВЗ падтрымліваюць мясцовыя адміністрацыі. У нашых, нават калі гулялі фіналы ў вышэйшай лізе, ніколі не было дзяржаўнай падтрымкі. Памятаеце, Маслякоў звычайна пералічвае спонсараў каманд? Дык калі даходзілі да БДУ, дзякавалі універсітэту і персанальна рэктару Казуліну, а таксама Беларускай чыгунцы — білеты да Масквы і назад былі адзінай дапамогай звонку. Каманду "ЧП" увогуле падтрымлівала прыватная кампанія з Украіны.

— У Клубе вясёлых і знаходлівых хтосьці адсочвае тэматыку і фармат жартаў?

— Зразумела! Кожную лігу вядзе рэдактар — аўтарытэтная і паважаная асоба ў колах КВЗ. Напрыклад, у вышэйшай лізе рэдактары — наш знакаміты Леанід Купрыда і Андрэй Чаврын (славутая каманда Харкаўскага авіяцыйнага інстытута). Вельмі жорстка з жартамі і сюжэтамі на рэлігійную тэматыку — у такім далікатным пытанні патрабуюць максімальнай акуратнасці. Не перабіраюць з тэмай нацыянальнасцяў. Дарэчы, пра чукчаў жартаваць ужо не модна. Новая "фішка" — гэта кыргызскія і мангольскія вучоныя (само словаспалучэнне смешнае, нам застаецца толькі прыдумаць іх такія ж смешныя вынаходніцтвы). З палітычнымі жартамі трэба быць асцярожнымі, хаця публіка іх заўсёды вельмі чакае.

— Вось пра гэта падрабязней. Не ўзнікала праблем на радзіме з асабліва смелымі сцэнарыямі? Помніце, як некалькі гадоў таму ў Баранавіцкім універсітэце ўспыхнуў скандал з-за таго, што студэнты пажартавалі наконт беларускага прэзідэнта...

— Пасля аднаго з маскоўскіх выступленняў "ЧП", у якім цэлы нумар быў пародыяй на Лукашэнку, нам патэлефанавалі. Супрацоўнік КДБ далікатна папярэдзіў, што трэба быць паасцярожней. Маўляў, мы ім вельмі падабаемся і органы тут ні пры чым, яны толькі хочуць засцерагчы нас, але ў прэзідэнта многа прыхільнікаў, якія проста вырашаць, што кавэзэшнікі здзекваюцца з кіраўніка дзяржавы, і хто гарантуе, ці не дадуць нам у цёмнай падваротні трубой па галаве. Ведаеце, сапраўды стала страшна. Каманда "ЧП" паехала на наступную гульню ў Маскву, зноўку добра пажартавала пра Лукашэнку і... з'ехала ва Украіну. Так неяк спакайней.

Вось і Вадзім Галыгін, які ў камандзе БДУ быў нязменным "прэзідэнтам", нейкі час не без падстаў не вельмі жадаў прыязджаць дадому. Не ведаю, наколькі сур'ёзныя афіцыйныя размовы з ім збіраліся весці, але мы ўсе жартавалі, што Вадзік "неўязны".

— Цікава, а каманды блізкага замежжа — яны ж таксама пра палітыкаў жартуюць, і нашы ўлады не абмінаюць, ды яшчэ і Пуцін на гульнях, бывае, прысутнічае...

— Толькі ўкраінцы могуць так добра паказаць Кучму і толькі беларусы — Лукашэнку. У расіян чужыя лідэры так смешна не атрымліваюцца, гэта ўжо даўно прыкмецілі. І ў расійскіх каманд ёсць свае "фірменныя" "пуціны". Калі сапраўдны Пуцін быў у зале, кавэзэшныя двайнікі вельмі актыўна са сцэны вялі з ім размову. Не магу ўявіць, каб штосьці падобнае магло адбыцца ў нас.

— А ці ёсць будучыня ў беларускага Клуба вясёлых і знаходлівых?

— Пераможца Еўралігі КВЗ, якую ладзяць у Мінску, аўтаматычна трапляе ў лігу вышэйшую. Але пасля "ЧП" беларусы ў сваёй дамашняй лізе, калі не памыляюся, так і не перамагалі. Прынамсі, больш у Маслякова нашых каманд не гуляла, і ў блізкай будучыні гэта, здаецца, не прадбачыцца. Што трэба, каб беларусам вярнуцца ў "вялікі КВЗ"? Грошы! Я ж казаў, што Клуб вясёлых і знаходлівых стаў шоу-бізнесам.

Таццяна ПАЎЛІКАВА.

ЭПІДЕМИЯ

Медики Минска не исключают начала эпидемии гриппа на следующей неделе

В Минске на прошлой неделе по сравнению с предыдущей количество заболевших гриппом и ОРВИ возросло на 25% и составило 25,5 тыс. человек.

Как сообщает сайт Мингорисполкома, об этом сообщил руководитель Минского городского центра гигиены и эпидемиологии, главный санитарный врач столицы Федор Германович на оперативном совещании в Мингорисполкоме.

По его данным, заболеваемость среди взрослого населения увеличилась на 28%, среди детей — на 33%. Удельный вес детей в структуре заболеваемости был несколько ниже обычного показателя и составлял 45%. Удельный вес больных, госпитализированных в стационары с диагнозами "грипп" и "ОРВИ", составил 1%.

Главный санитарный врач столицы отметил, что превышение порогового уровня наблюдалось в понедельник и вторник. По прогнозам, на нынешней неделе сохранится тенденция роста заболеваемости — в пределах до 20%. *"В случае устойчивого превышения порогового уровня в Минске на следующей неделе не исключено введение комплекса противоэпидемических мероприятий"*, — сказал Федор Германович.

КОГДА ВЕРСТАЛСЯ НОМЕР...

Стало известно, что в Беларуси началась эпидемия гриппа. Первыми городами, где введен комплекс противогриппозных мероприятий, стали Молодечно и Гомель. Об этом сообщил главный эпидемиолог Министерства здравоохранения Республики Беларусь Анатолий Кожемякин.

Он напомнил, что однократные превышения эпидемического порога заболеваемости гриппом и ОРВИ наблюдались в течение прошлой недели в большинстве из 18 контрольных городов. Однако для объявления начала эпидемии гриппа в каком-либо из них необходимо, чтобы устойчивый рост с превышением эпидемического порога заболеваемости регистрировался в городе на протяжении 3—4 дней.

Анатолий Кожемякин напомнил, что во время эпидемии гриппа ограничивается посещение больных лечебных учреждений и проведение массовых мероприятий в организованных коллективах, закрываются школы, где болеет более трети учащихся.

Птушыны грып: усё бліжэй

Трывожныя навіны прынёс пачатак гэтага тыдня: птушыны грып усё бліжэй і бліжэй да Беларусі, эпідэмія ўспыхнула ў Падмаскоўі, прычым па папярэдніх звестках вірус можа быць небяспечны для чалавека.

Начальнік галоўнага ўпраўлення ветэрынарыі, галоўны дзяржаўны ветэрынарны інспектар Аляксандр Аксёнаў, аднак, запэўнівае, што ў Беларусі робіцца ўсё магчымае па недапушчэнні віруса ў нашу краіну.

У Беларусі пачалася планавая вакцынацыя птушкі на асабістых падвор'ях бліз вадаёмаў і птушкафабрык.

Пасля першых паведамленняў аб эпідэміі ў Падмаскоўі былі праверены ўсе рынкі Беларусі, на каторых гандаль жывой птушкай забаронены. Зафіксаваны толькі адзін выпадак парушэння гэтага загаду — на сталічным рынку ў Ждановічах. Прайшлі таксама праверкі выканання санітарных норм на буйных птушкафабрыках: заўваг у ветэрынараў няма. Але ў бліжэйшы час прапаноўваецца правесці вучэнні па ліквідацыі ачага магчымай інфекцыі. На ўсялякі выпадак...

Ігар МАРОЗАЎ.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Вінцэсь Мудроў: страшныя фоткі і любімыя картачкі

Напрыканцы мінулага тыдня адбылася прэзентацыя чарговай кнігі "Бібліятэкі Свабоды". Гэта тэксты леташніх перадач "Летні альбом", у якіх знаны літаратар Вінцэсь Мудроў з Полацка распавядаў пра савецкую рэчаіснасць. Пісьменнік не падзяляе настальгічных пачуццяў тых, хто сэрцам і розумам забуксаваў у "светлым учора", але ж і не бярэцца судзіць гэты страшнаваты час. Ён проста згадвае і распавядае. У ягонай іроніі няма ні каліва помслівасці.

Кніга складаецца з пяці раздзелаў — "Любімыя картачкі", "Здымкі з раённай газеты", "Музычныя паштоўкі", "Страшныя фоткі" і "Фатаграфіі з натуры". Кніга атрымалася пра ўсё. Не будзе памылкай назваць яе энцыклапедыяй жыцця паспалітага савецкага грамадзяніна ад пачатку 1960-х да сярэдзіны 1980-х гадоў. Людміла Зыкіна і Муслім Магамаеў, Фідэль Кастра і Анжэла Дэвіс, Пражская вясна і "Малая зямля", керагаз і туалетная папера, хунвэйбіны і Палітбюро, боты-панчохі і кітайскія тэрмасы... На першы погляд, падборка сюжэтаў можа падацца бессістэмнай, выпадковай. Але, закрыўшы апошнюю старонку кнігі, маеш цэльную, дакладную карціну эпохі.

Асабіста я не сумую па дзяржаве, якую паспяхова пахавалі ў Віскулях, але вандроўка ў БССР з Вінцэсем Мудровым была для мяне прыемнай, як памятны з дзяцінства смак газвады з сіропам.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Цудоўная імправізацыя

У гонар нацыянальнага свята Літвы — Дня аднаўлення дзяржаўнасці — у Мінску адбылася прэзентацыя сумеснага музычнага літоўска-беларускага праекта "Tylos Labanoro" (Цішы Лабаноры).

Пачатак праекта быў закладзены чатыры гады таму Тодарам Кашкурэвічам і літоўскім фатографам Гвідасам Каверам як форма музычнай імправізацыі падчас шматлікіх паездак па святых язычніцкіх мясцінах Літвы і Беларусі.

У 2006 годзе падтрымаў і пагадзіўся на ўдзел у праекце сусветна вядомы літоўскі джаз-саксафаніст Пятрас Вішняўскас. Вынікам сумеснай творчасці стаў запіс кампакт-дыску "Tylos Labanoro".

Згодзен: лупяць тры шкуры, а кажуць, што дбаюць пра народ

Згодзен з аўтарамі артыкулаў "Остановите коммунальщиков!" і "За все коммунальные услуги мы давно переплачиваем". Мае падлікі пацвярджаюць іх высновы. Так, газ у сакавіку 2001 года каштаваў 851 рубель за тысячу кубаметраў, у канцы 2005 года — 7620 рублёў, значыць, кошт павялічыўся ў 8,95 раза, ці на 895 працэнтаў.

Электраэнергія на пачатку 2001 года каштавала 14,4 рубля, у канцы 2005 года — 88,1 рубля. Такім чынам, кошт павялічыўся ў 6,12 раза, ці на 612 працэнтаў. У квартплату тады ўваходзіў і кошт гарачай вады. Пазней аплату падзялілі, але я падлічыў агульную суму. Дык вось у лютым 2001 года ўсё гэта каштавала 9432 рублі, у канцы 2005 года — 79.490 рублёў. Відавочнае павелічэнне ў 8,43 раза, ці на 843 працэнты.

Халодная вада на пачатку 2001 года каштавала 2462 рублі, пад канец 2005 года — 14.850 рублёў, кошт павялічыўся ў 6,03 раза, ці на 603 працэнты.

Вываз смецця з 2003 года каштаваў 1083 рублі, на канец 2005 года — 2030 рублёў, павелічэнне ў 1,87 раза, ці на 187,4 працэнта. І гэта пры тым, што новыя тэхналогіі робяць адходы неаб'ёмнымі, кампактнымі і няцяжкімі, і прытым, што газ не даражэў, электраэнергія таксама.

Што будзе праз год ці два, можна толькі здагадвацца — лепшага не будзе... Асабліва для людзей малазабяспечаных, пенсійнага ўзросту. Улады кінуць ім капейку, а забяруць тры.

Юрый КОНЫШКА.

г.Орша.

КРЫМІНАЛ

Нелюдзі

Устаноўлены падазроныя ва ўчыненні чатырох разбойных нападаў на састарэлых людзей у Бабруйску і Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці ў 2002—2003 гадах. Пра гэта БелаПАН паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі.

Падчас аператыўна-вышукавых мерапрыемстваў высветлена, што злачынствы ўчынілі чатыры раней судзімыя грамадзяне. Адзін з іх, ужо судзімы за крадзеж і разбой, затрыманы ў мінулыя выхадныя. Двое адбываюць пакаранне за крадзяжы і прымушэнне да выканання абавязацельстваў. Яшчэ адзін злачынца, раней судзімы за крадзеж і рабаванне, адшукваецца праваахоўнымі органамі.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

СТАЛІЦА

Прытулак для багатых

У Мінску сёлета адкрыецца новы гатэль "Вікторыя" класа "чатыры зоркі", паведамілі БелаПАН у гатэльна-сэрвісным камунальным унітарным прадпрыемстве "Сталіца". Гатэль размешчаны на праспекце Пераможцаў непадалёк ад завода "Атлант".

Замоўцы будаўніцтва плануюць, што гатэль адкрыецца праз 130 дзён.

Як зазначыў дырэктар прадпрыемства Барыс Крыцкі, *"у краіне гэта пакуль адзіны аб'ект такога класа, што аб'яднаў у сабе функцыі бізнесу і адпачынку". "У цэлым мы яго пазіцыянуем як цэнтр камерцыйных сувязяў з гатэльным комплексам"*, — сказаў ён.

У гатэлі будзе 115 аднамесных нумароў, 45 двухмесных, восем люксаў і апартаменты. У нумарах прадугледжана міжнародная тэлефонная сувязь, высакахуткасны доступ у Інтэрнет, інтэрактыўнае тэлебачанне. У гатэлі будзе працаваць канферэнц-зала, пакой для перамоў, VIP-зала. Можна будзе пакарыстацца паслугамі сакратара-рэферэнта, перакладчыкаў, капіравальна-размнажальнага цэнтра.

Марына НОСАВА.

У НАС И У НИХ

Тюрьма познается в сравнении

Правдивыми рассказами об условиях быта в учреждениях белорусской пенитенциарной системы можно довести до состояния легкого шока практически любого неподготовленного иностранца. Холодные камеры, автозаки, антисанитария — вот лишь малая толика того, с чем приходится столкнуться отечественному заключенному. Но прогресс просачивается даже через колючую проволоку и толстые решетки, облегчая жизнь "постояльцев". Согласно недавнему постановлению Совета министров, с 1 января заключенные будут не только употреблять больше мяса и рыбы, но и получать туалетную бумагу, женские гигиенические средства, а также одноразовые бритвы.

"Все относительно, но с уверенностью скажу, что большинство из нашего контингента на свободе таких условий, как в тюрьмах, не имеют. Тут они три раза в день получают горячее питание, еженедельно моются в бане, вынуждены вести здоровый образ жизни, медицинское обслуживание для этой категории людей однозначно более доступно, — сказал "Ежедневнику" начальник медицинской службы Департамента исполнения наказаний МВД РБ **Василий ЗАВАДСКИЙ** и добавил: — Если говорить о других бытовых условиях, то нам, конечно, пока далеко до западных стран. Тем не менее в последние годы идет гарнизонное строительство в местах лишения свободы, также предусмотрена реконструкция объектов уголовно-исправительной системы".

Василий СЕМАШКО провел в немецких тюрьмах около полугода. Сегодня своими воспоминаниями он делится с читателями "Е":

— В Германии и вообще в Западной Европе лагерей, как в Беларуси, нет — только тюрьмы, в которых имеются следственные отделения и отделения для отбытия наказания. Среднестатистическая немецкая тюрьма выглядит примерно следующим образом: камеры в большинстве одноместные или на двоих. На окнах — толстые решетки. Обстановка камеры: стол, обычные простые стулья, отгороженный занавеской санузел. Рядом с входной дверью расположена металлическая панель с динамиком и кнопками управления радио, светом, связи с охраной. Очень удивили меня имевшиеся в каждой камере пробковые доски для того, чтобы заключенные крепили к ним картинки и фотографии, не портя стен.

Сравнивать тюрьмы Германии с нашими — это все равно, что сравнивать "Порше" и "Запорожец". Можно ли представить, чтобы в наших тюрьмах заключенному давали котлеты по-киевски, индюшачьи ножки в панировочных сухарях, йогурты, колбасу, бананы? В этой же стране заключенный может нормально существовать в тюрьме только на том, что ему дает государство. В социальный комплект входят пижама, мыло, одноразовые бритвы, кисточки для бритья, зубная паста и щетка, шампунь и мочалка.

Кормят три раза в день: в 6.00, 11.00 и 16.00. Кому мало — пожалуйста, в тюремный магазин, где некоторые закупают даже питьевую воду. Помимо продуктов, одежды и средств личной гигиены тут продают и порнографические журналы. Лимит закупок на две недели для подследственных — 150 евро, для осужденных — 40. Некоторые заключенные так обустраивают свою камеру, что она больше напоминает гостиничный номер или престижное студенческое общежитие со стадионом и спортивным залом.

Учитывая интернациональный состав заключенных (истинных арийцев среди них — не более 30%), в библиотеке имеются книги не менее чем на 10 языках. Кое-где для зэков организуют курсы немецкого языка.

При тюрьмах существуют небольшие производства: мне довелось собирать детские игрушки "Плэймобил" (аналог известного конструктора "Лего"). Вместе с тем услугами заключенных пользуются и такие солидные компании, как "БМВ" и "Сименс".

В любой тюрьме русскоговорящие держатся вместе, помогают друг другу, создают "общаки" из чая и сигарет, ставят брагу и гонят самогон. Поляки, зная о русских традициях взаимовыручки стараются держаться ближе к ним. Немцы — полнейшая противоположность русским. Если бы в тюрьме сидели одни немцы, охрана была бы не нужна: немецкие заключенные сами организовали бы свою охрану. Если они по делу проходят группой, то сразу же дают полные показания друг на друга. В тюрьме они охотно выполняют все правила поведения, донося администрации о любых нарушениях со стороны других заключенных.

Екатерина ХАРИНА.

ПРЯМАЯ РЕЧЬ

Дмитрий КАПУСТИН, сексопатолог:

В сексе, как и в спорте, нужны тренировки

— Иногда даже, наоборот, человек, испытывающий проблемы с сексом, блестяще реализует себя как общественный деятель или бизнесмен. Зато его несостоятельность в постели очевидна для женщины. Единичные срывы бывают у всех, даже у сексопатологов. Но если они регулярны, то мужчина старается реже вступать в половую связь. И почему-то жена этого не замечает. Мне кажется, мужчины в последнее время выкупили секс у собственных супруг, зарабатывая на особняки, машины, шубы... Жен это устраивает. Они делают вид, что секс не так уж и важен.

К тому же появилась "Виагра", а также полтора десятка афродизиаков. Решать сексуальные проблемы с помощью этих препаратов, все равно что при зубной боли вместо похода к стоматологу принимать упаковками таблетки анальгина. Зубов у нас, слава Богу, 32. Один загубим, остальные останутся. А тут над единственным органом нависает угроза недееспособности! Но когда надо стремительно действовать, никто не задумывается над тем, что просто загоняет симптомы болезни внутрь. Это ведь так просто: принял таблетку и получи 90% гарантии успеха. Не надо тратить время на поход к врачу и обследование, деньги на лечение. Хотя эти препараты стимулируют не потенцию, как многие верят, а общий тонус.

— Но они же улучшили среднее качество секса по стране?

— Нет. Что улучшает показатели спортсмена? Тренировки. Все остальное — только форма, в которой он бегает. Вот и качество секса улучшает только регулярная половая жизнь. Если ее нет, мужчина, особенно после 40 лет, начинает "затухать". В сексологии даже существует такое понятие, как сексуальная детренированность. Если мужчина не живет половой жизнью неделями и месяцами, его половая система "консервирует" себя до минимального уровня. Для сохранения своего здоровья мужчине приходится искать секс на стороне.

Женщинам тоже непросто через 10—15 лет совместной жизни вдруг заявить супругу, что секс ей нужен больше, чем в 25 лет. Такая активность мужа испугает.

В общем, качество у нас так себе: мужчины выбирают "Виагру", женщины — вибраторы, а врач в этом процессе — третий лишний.

www.gazetaby.com

РЭГІСТРАТУРА

Кожны другі сталы беларус мае залішнюю вагу

І толькі менш чвэрці жыхароў краіны стараюцца правільна харчавацца

Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі правёў адмысловае даследаванне — якія прадукты звычайна з'яўляюцца на стале беларусаў. Высветлілася, што ў 2004 годзе сярэдні беларус вельмі мала ўжываў у ежу найбольш цэнных у біялагічных адносінах прадуктаў — мяса, малака, кісламалочных прадуктаў, морапрадуктаў, а таксама садавіны, агародніны і алею. Так, напрыклад, толькі ў 16,3% беларусаў некалькі разоў на тыдзень з'яўлялася ў рацыёне рыба. Усяго 50 працэнтаў насельніцтва штодня ядуць садавіну і агародніну.

З таго часу, кажуць спецыялісты, значных змен у харчаванні беларусаў не адбылося. Толькі да прыхільнікаў садавіны і агародніны, якія ні дня не могуць без яблыка ці свежай капусты, далучылася два працэнты. Па-ранейшаму амаль 30 працэнтаў беларусаў харчуюцца абы-як. Але ўсё ж такі нейкія станоўчыя зрушэнні ў гэтым напрамку ёсць. Напрыклад, амаль 60% беларусаў пры прыгатаванні ежы ўжываюць ёдаваную соль, 21% — прытрымліваюцца рэжыму харчавання.

Аднак нерацыянальнае харчаванне і адсутнасць фізічных нагрузак — прамая дарога да лішняй вагі. Сёння кожны другі беларус ва ўзросце 40—60 гадоў "носіць" лішнія кілаграмы. Актуальнай стала праблема залішняй вагі і для дзяцей: з гэтай праблемай сутыкнуўся кожны чацвёрты маленькі жыхар краіны.

Медыкі напамінаюць, што непатрэбныя кілаграмы — гэта не толькі не прыгожа, лішняя вага правакуе такія захворванні, як сахарны дыябет, панкрэатыт, гіпертанічную хваробу і нават рак.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

ТЫМ ЧАСАМ

У мінскіх школах з'явяцца адмысловыя повары

У недалёкім будучым у дзіцячых садках і школах Мінска з'явяцца спецыяльна адукаваныя повары. Першы выпуск спецыялістаў Мінскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча кулінарыі №221 рыхтуе ўжо ў канцы лютага. Сярод 27 спецыялістаў у асноўным дзяўчаты.

МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ

Чатыры ўзроўні харчавання

Спецыялісты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя прыдумалі адмысловую піраміду, якая наглядна тлумачыць, што значыць здаровае харчаванне. На чатырох узроўнях спецыялісты размясцілі ўсе прадукты, якія прысутнічаюць у нашым меню.

***Першы ўзровень:** злакі, крупы, хлеб. Гэта аснова рацыёна.*

***Другі:** гародніна і садавіна. У суткі — не меней за 5 штук.*

***Трэці:** мясныя і малочныя прадукты, арэхі, яйкі. Ужываць у меру.*

***Чацвёрты:** жыры, салодкае і алкаголь. Як мага меней.*

НУ І НУ!

Школьнікі кінулі курыць

Цікавае даследаванне абнародавана ў Брэсцкай вобласці.

Газета "АіФ у Беларусі" паведамляе, што вучні старэйшых класаў горада Баранавічы прынялі ўдзел у незвычайным апытванні. 1500 школьнікаў 8—10 класаў адказалі на пытанне, курыць яны ці не.

Высветлілася, што каля 8,5% апытаных ужо... кінулі курыць. 5% курыць увесь час, а 6% — раз-пораз.

Большасць з тых, хто прыняў удзел у апросе (40%), першую цыгарэту выкурылі ў 15 альбо 16 гадоў. А 25 чалавек увогуле пачалі курыць у пачатковай школе.

Толькі 50% рэспандэнтаў ад 14 да 16 гадоў не курыць.

Што яшчэ насцярожвае — пятая частка апрошаных старшакласнікаў не толькі курыць, але і ўжывае алкаголь адзін-два разы ў месяц. 7,7% рэспандэнтаў прызналіся, што выпіваюць раз у тыдзень, а 4,3% паведамілі, што ўжываюць спіртныя напоі 2-3 разы ў тыдзень. І толькі 43% апрошаных школьнікаў абыходзяцца без віна і піва.

Алеся КОВАЧ.

КОНСУЛЬТАЦИЯ

Вода без хлорки

Чем отличаются разные виды «минералки», и почему Минздрав Беларуси принял новые требования к ней?

"Скажи мне, что ты пьешь, — и я скажу, что ты есть". Если перефразировать известное изречение, получается следующее: человек представляет собой то, что он пьет.

